## План адкрытага пазакласнага мерапрыемства

**Тэма мерапрыемства:** «***Прыгатаванне першых страў***»

**Тып:** абагульненне і замацаванне ведаў з элементамі гульнёвых тэхналогій па прыгатаванні і падачы супоў.

**Мэта:** замацаваць веды навучэнцаў пра класіфікацыю і тэхналогіі прыгатавання першых страў.

**Задачы:**

- -замацаваць веды навучэнцаў па правілах варкі заправачных супоў і па апрацоўцы сыравіны, прыгатаванні булёнаў і паўфабрыкатаў для прыгатавання 1-х страў, захоўваючы правілы санітарыі і гігіены, а таксама бяспечныя метады працы.
- -замацаваць веды і ўменні па прыгатаванні заправачных супоў, водпуску і сервіроўцы.
- -развіваць у навучэнцаў пачуццё адказнасці, калектыўнай працы; творчую актыўнасць, акуратнасць, уменні аналізаваць свае дзеянні, працаваць у камандзе.
- -развіваць пазнаваўчую актыўнасць і інтарэс да вывучаемага матэрыялу, творчае мысленне, прафесійнае маўленне напярэдадні вывучэння вучэбнага прадмета “Беларуская мова (прафесійная лексіка ў галіне грамадскага харчавання).
- -развіваць навыкі карыстання даведачнай, нарматыўна-тххналагічнай дакументацыяй.
- -выхоўваць у навучэнцаў пачуццё адказнасці за выкананую працу, фарміраваць культуру працы і эстэтычны густ.
- -развіваць самастойнасць пры вакананні заданняў, пачуццё ўпэўненасці ў сабе, а таксама прывіваць любоў да абранай прафесіі і з дапамогай ведаў па беларускім фальклоры, роднай мове і літаратуры, беларускай нацыянальнай культуры і традыцыям беларусаў.

**Форма правядзення:** конкурс.

**Метадычная мэта:** актывізацыя разумовай дзейнасці з выкарыстаннем элементаў тэхналогіі асобасна арыентаванага навучання і гульнёвых тэхналогій.

**Форма дзейнасці навучэнцаў:** групавая, індывідуальная.

**Матэрыяльна-тэхнічная забяспечанасць:** мультымедыйны праектар і камп’ютар, слайдавая прэзентацыя з заправачнымі супамі, дыдактычныя матэрыялы — схемы, ілюстрацыі супоў, карткі з заданнямі, красворды, тэсты, табліцы, творчыя моўныя і літаратурныя заданні па тэме.

**Міжпрадметныя сувязі:** асновы мікрабіялогіі, санітарыі і гігіены, асновы фізіялогіі харчавання, тавараснаўства харчовых прадуктаў, беларуская і руская мовы і літаратуры, нацыянальны фальклор.